# Развіццё арфаграфічнай пільнасці ў адзіннацацікласнікаў

## Урок беларускай мовы ў 11 класе

**А. П. Хрышчановіч,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
вышэйшай катэгорыі
СШ № 16 г.Ліды

**Тэма:** Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапіс у, ў

**Мэты:** садзейнічаць замацаванню і паглыбленню ведаў вучняў аб правапісе спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапісе прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапісе у, ў

**Задачы:** стварыць умовы для развіцця арфаграфічнай пільнасці, спрыяць удасканаленню арфаграфічных і лексічных навыкаў, фарміраваць уменне правільна працаваць з падручнікам.

**Абсталяванне:** мультымедыйная ўстаноўка, прэзентацыя, дадатковы матэрыял для вучняў

**Ход заняткаў**

**І. Арганізацыйна-матывацыйны этап**. Стварэнне псіхалагічнага настрою.

**Настаўнік:** Я вітаю тых, хто сёння з задавальненнем ішоў у школу;
Хто трывожыўся з розных прычын;
Тых, у каго добры настрой;
Тых, хто любіць вучыцца;
Тых, хто хоча атрымаць трывалыя веды.

**ІІ Этап мэтавызначэння**

**Настаўнік:** Сёння на ўроку мы з вамі далей працягваем знаёмства з правапісам слоў, заснаваных на фанетычным прынцыпе. Тэма гучыць так: “Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах; правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных; правапіс у, ў”

Давайце вызначым задачы, якія сумесна на ўроку будзем вырашаць. Звярніце ўвагу на дошку, дзе запісаны апорныя словы

Будзем ведаць…

Будзем умець…

Будзем выкарыстоўваць

**Настаўнік:** Запішыце, калі ласка дату і тэму ўрока ў сшыткі

*(Вучні запісаць у сшыткі дату і тэму ўрока)*

**ІІІ Актуалізацыя і замацаванне раней засвоеных тэм**

**Настаўнік:** на ўроку мы будзем працаваць са словам, беларускім, запазычаным, словам, якое нам часта сустракаецца ў жыцці і якое абавязкова сустрэнецца і на экзаменах, і на ЦТ. Звярніце ўвагу на эпіграф нашага ўрока:

Слова – радасць, слова – чары,
Вобраз вечна юных вёсен,
Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары,
Ты глядзіш праз неба просінь.

Якуб Колас

Якое значэнне адводзіць аўтар слову? *(Адказ вучняў аб ролі слова ў вусным і пісьмовым маўленні)*

**Настаўнік:**Слова – наш інструмент, без яго немагчыма існаванне людзей. А дзе слова, там і мова. Нездарма гаварыў Ф. Багушэвіч : “Мова – адзежа душы чалавека”.

Правільна выкарыстоўваць словы ў вусным, а тым больш , у пісьмовым маўленні нам дапамагае правапіс, а дакладней, прынцыпы беларускага правапісу.

Хачу звярнуць увагу на ацэначныя лісты, якія знаходзяцца перад вамі і якімі мы будзем карыстацца на працягу працы на ўроку. Падпішыше іх і пасля выканання кожнага задання выстаўляйце, калі ласка, балы. Прыступаем да працы

Давайце ўспомнім матэрыял папярэдняга ўрока —выканаем графічны дыктант. Я зачытваю сцвярджэнні, а вы ставіце у табліцу плюс, калі яно правільнае, або мінус, калі сцвярджэнне няправільнае.

**Прыём “Графічны дыктант”**

1. Правапіс беларускай мовы грунтуецца на фанетычным, марфалагічным, традыцыйным і дыферэнцыраваным прынцыпах.
2. Да фанетычнага прынцыпа адносіцца перадача акання.
3. Правапіс зычных на стыку марфем.
4. Правапіс **е, ё – я.**
5. Напісанне літары **ц** на месцы спалучэнняў **т, ч, к, ц** і суфіксальнага **с** (у суфіксах -**ск-, -ств-**).
6. Правапіс шыпячых перад свісцячымі і свісцячых перад шыпячымі.
7. Правапіс **е** ў прыназоўніку **без** і часціцы **не.**
8. Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах.
9. Парвапіс спалучэнняў **зн, нц, рц, рн, сн, сл.**
10. Правапіс звонкіх зычных на канцы слоў і перад глухімі.
11. Яканне.
12. Правапіс **у** і **ў** у залежнасці ад пазіцыі ў слове.
13. Напісанне прыставак і прыназоўнікаў на **-б,-д**, а таксама прыназоўнікаў на –**з.**
14. Правапіс прыстаўных гукаў.
15. Правапіс падоўжаных зычных.
16. Ужыванне вялікай і малой літары пры напісанні ўласных і агульных назоўнікаў:*Цётка (паэтэса) і цётка.*

**Табліца (ключ)**

| № сцвяр-джэння | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | 11 | 12 | 13 | 14 | 15 | 16 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Адказ | + | + | - | + | + | - | - | + | + | - | + | + | - | + | + | - |

**IV Тэарэтычны блок**

**Настаўнік:** Як вы правільна сцвердзілі ў графічным дыктанце, правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапіс у, ў адносяцца да фанетычнага прынцыпу напісання, і мы з вамі звернемся да тэарэтычнага матэрыялу па тэме ўрока. Знаёства з новым матэрыялам мы будзе ажыццяўляць у групах. Кожнай групе неабходна прачытаць тэарэтычны матэрыял у падручніку і запоўніць белыя плямы ў кластары.

**1-я група** запаўняе кластар па тэме "Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах" (§ 15, с. 71).

**2-я група** запаўняе кластар па тэме "Правапіс у, ў" (§ 15, с. 78)

**3-я група** запаўняе кластар "Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных" (§ 15, с. 74)

**4-я група** запаўняе кластар "Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных" (§15, с. 74).

**Кластар 1-й групы**

**"Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах"**

| **У рускай мове** | **У беларускай мове** | |
|---|---|---|
| | **пад націскам** | **не пад націскам** |
| **ИО** | **ІЁ ЫЁ** | **ІЯ** |
| **ИА** | **ЫЯ** | |
| **ИЕ** | **ЫЕ** | |
| **ЕО** | **ЭО** | |
| **ЕА** | | **ЕА** |
| **ЙЕ** | | |
| **ЙО** | **Ё** | |
| **ЙА** | | |

**Ключ**

| | **пад націскам** | **не пад націскам** | **выключэнні** |
|---|---|---|---|
| **ИО** | **ІЁ ЫЁ**<br>біёлаг, патрыёт | **ЫЯ ІЯ**<br>біялогія, патрыятычны | мільён, трыльён, шампіньён |
| | **ІО**<br>іон, Іосіф | **ІА**<br>іанізацыя | |
| **ЕО** | **ЕО ЭО**<br>фразеолаг, акардэон | **ЕА**<br>фразеалогія | |
| **ЙО** | **Ё**<br>ёд, раён | **Я**<br>маянэз, раяніраванне | |
| **ИА** | **ІЯ ЫЯ**<br>Авіяцыя, авіяцыйны | | |
| **ЕА** | **ЕА ЭА**<br>Неапаль, тэатр | | |
| **ИЕ** | **ІЕ ЫЕ**<br>кліент, дыета | | |
| **ЙЕ** | **Е**<br>фае, канвеер | | |

### Кластар 2-й групы “Правапіс *У, Ў*”

| **№ п/п** | **Літара *у (у* складовае *) пішацца*** | **Літара *ў (ў* нескладовае *) пішацца*** |
|---|---|---|
| *1.* | У пачатку сказа, пасля … | У пачатку … |
| *2.* | | У сярэдзіне слова пасля … |
| 3. | У запазычаных словах… | Пры чаргаванні [ в ] з … |
| 4. | *… аул, баул* | |
| 5. | | Пасля злучка ці… |

**Ключ**

| **Літара *у (у* складовае *) пішацца*** | **Літара *ў (ў* нескладовае *) пішацца*** |
|---|---|
| У пачатку сказа, пасля знакаў прыпынку і пасля зычных: *У ціхім шолаху развяваліся сцягі, асветленыя сонцам, ярка блішчалі і звінелі медалі. Яны, мусіць, усё ж не звінелі, але яму гэтага хацелася, і ён, здаецца, чуў іхні звон* | Пасля галоснах у пачатку слова: *на ўкраінскай мове, на ўзлеску, ва ўніверсітэце, царква ўніяцкая, метады ўніверсальныя* |
| У пачатку ўласных назваў: *каля Узды, ва Узбекістане, Галіна Уладзіміраўна* | У сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: *аўдыторыя, паўза, маўзалей, лаўрэат, саўна, фаўна, аўра, раўнд* |
| У запазычаных словах, якія заканчваюцца на *–ум, -ус: прэзідыум, радыус, соус* | Пры чаргаванні [ л ] з [ ў]: *чытаў, думаў, воўк, шоўк;* але: *памылка, сеялка, Балгарыя, Алжыр* |
| У словах з націскным *у : аул, баул, Брэсцкая унія, каля урны* | Пры чаргаванні [ в ] з [ ў]: *лаўка (лава), аўса (авёс), кроў (крыві), Аўстрыя, Каўказ;* але: *ва В’етнаме, на рацэ Влтава* |
| У канцы запазычаных слоў не пад націскам : *фраў, Шоу, ноу-хау* | Пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: *хлопцы-ўмельцы, гучнае “ўра”* |

**Настаўнік:** Я яшчэ хачу, каб вы звярнулі ўвагу на эпіграф нашага ўрока. Якія парушэнні правапісу вы заўважылі?
*(Парушэнні ў правапісе “**ў**” пасля знакаў прыпынку)*
Растлумачце такі правапіс.
(*Каб стварыць рытм верша, аўтар дапускае такія парушэнні: пасля коскі ў трэцім радку Якуб Колас выкарыстоўвае “ў”*)

Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары,
Ты глядзіш праз неба просінь.

´__ __ | __´__ | __ ´__ | __ ´__

´__ __ | ´__ __ | ´__ __ | ´__ __ (*Верш напісаны харэем (двухскладовая стапа з націскам на першым складзе*)

**Настаўнік:** А ці ведаеце вы, што ў Беларусі ёсць горад, у якім паставілі помнік “**ў**”? (*Полацк*)
Вучань атрымаў папераджальнае заданне, звязанае з помнікам літары “ў”

**Прыкладнае паведамленне вучня.**__**Помнік “Ў”**__

7 верасня 2003 года ў Полацку быў устаноўлены помнік літары “**ў**”. Ён зроблены ў выглядзе стэлы, на яе гранях размешчаны рэльефныя выявы літары.

Помнік можа служыць сонечным гадзіннікам. Пры яго адкрыцці, што адбывалася падчас святкавання Дня беларускага пісьменства, гаварылася пра ўнікальнасць літары “ў” , сцвярджалася, што такой літары няма ў алфавітах свету, распавядалася пра непаўторную меладычнасць і мяккасць гуку, пазначанага ёй. Менавіта гэтай літары выпаў такі лёс, за што яна і была ўганаравана помнікам удзячнымі нашчадкамі.

**Настаўнік:** Якія славутыя людзі нарадзіліся ў Полацку?
(*Вучні ўспамінаюць Е. Полацкую, Ф Скарыну і іх дзейнасць для ўмацавання беларускага пісьменства. Дэманструюцца фотаздымкі*)

**Кластар 3-й групы**
**“Правапіс прыстаўных і устаўных галосных”**

| **Прыстаўная літара а пішацца:** | |
|---|---|
| **Тэарэтычны матэрыял** | **Прыклады** |
| у некаторых словах перад збегам зычных, першы з якіх **…………** | аржаны, аржанішча, амшара, амшарына |
| **Заўвага**! Гэтыя ж словы могуць ужывацца з прыстаўной літарай і: іржаны, іржанішча, імшара, імшарына. | |
| **Правапіс прыстаўной літары і** | |
| **Прыстаўная літара і пішацца** | **Прыклады** |
| у пачатку слоў перад спалучэннем літар, першая з якіх …………… | |
| перад літарай ….. заўсёды | імгненне, імчаць, імгла, імшысты |
| перад літарамі ……., калі гэтым словам пачынаецца сказ | ірвецца ў прастор вадаспад белапенны |
| перад літарамі ….., калі слова стаіць пасля знака прыпынку | іржавы, ільняны |
| перад ……, калі слова знаходзіцца пасля папярэдняга слова на зычную | з’езд ільнаводаў, дрот іржавы |
| **Прыстаўная літара і не пішацца** | **Прыклады** |
| у пачатку слоў перад спалучэннем літар, першая з якіх л, м, р | |
| пасля прыставак, якія заканчваюцца на ….. | памчаць, замглѐны, памкнуцца, зардзецца |
| пасля першай часткі складаных слоў, якія заканчваюцца на ……… | вокамгненна |
| перад л і р, калі слова знаходзіцца пасля …………… слова на галосную | на з’ездзе льнаводаў, луста ржанога хлеба |

**Кластар 4-й групы**
**“Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных”**

| **Правапіс прыстаўной літары г** |
|---|

| |
|---|
| у некаторых словах, параўн.: история, Анна (руск.) – гісторыя, Ганна (бел.) |
| у займенніках: гэты, гэтакі |
| у няпэўна-колькасным лічэбніку гэтулькі |
| у прыслоўях: гэтак, гэтаксама, дагэтуль, адгэтуль |
| у часціцах: гэта |
| у выклічніках: гэй, гэ, га, го |
| **Правапіс прыстаўной літары в** |
| Перад ….. у словах славянскага паходжання ў пачатку слоў, у сярэдзіне пасля прыстаўкі на галосны, ці першай часткі складанага слова: в + ó... = вóсень, вóкны, вóльха, вóблачны, завóблачны, шматвóпытны |
| у словах …… і вытворных ад іх незалежна ад націску: вачаняты, навастрыць, завастрыць, наваколіца |
| у пачатку і сярэдзіне некаторых … назваў: Вóльга, Вóсіп, Вóгненная зямля, Лявóн, Ларывóн, Радзівóн і вытворных ад іх: Лявонава, Радзівонаўна, Восіпаўна |
| Перад ……. славянскага паходжання: вугаль, вучань, вуліца |
| перад у каранёвым у ……. або другой часткі складанага слова: завушніцы, павучок, чарнавус |
| ва …… імёнах Навум, Матэвуш, Тадэвуш і вытворных ад іх: Навуменка, Тадэвушаў |
| Запомніце! вушанка, вугор, вустрыца, цівун |
| **Прыстаўная в не пішацца** |
| перад а ……. : асенні, акно, аблокі |
| перад ó націскным у словах …….. паходжання: óда, óптыка, óпера, óрдэн |
| у словах оканне, окаць; |
| у словах оханне, охаць (але вохканне) |
| Запомніць! НАОГУЛ |
| у словах … паходжання: унія, ультрафіялетавы, унікум |
| перад у … : усход, узвар, ускочыць |
| ва ….. назвах: Урал, Украіна, Ульяна |
| перад у, якое развілася з рускага : внук, власть, внимание (руск.) – унук, улада, увага (бел.) |
| Запомніць! урна, уюн |

**Фізхвілінка “Гімнастыка для вачэй”**

Настаўнік прапануе вучням сесці роўненька, заплюшчыць вочы і выканаць некалькі практыкаванняў: выканаць вачыма васьмёрку ў правы бок пяць разоў, затым – у левы бок. Пяць разоў кругавыя рухі вачэй у правы бок і наадварот. Хвілінку пасядзець з заплюшчанымі вачыма без рухаў, а затым расплюшчыць вочы і ўважліва паглядзець наперад перад сабой ў адну кропку восем секунд.

**V Трэніровачна-карэкцыйны этап**

**Настаўнік:** На дадзеным этапе мы будзем замацоўваць тэарэтычныя веды па тэме ўрока.

**Першы раздзел** “**Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах”** Працуем у групах**(Узаемаправерка**).

**1 група**

***Перакладзіце на беларускую мову словы і запішыце іх.***

Иерусалим, Иаков, Эфиопия, Альбион, Илиада, Циолковский, Индия, Кордильеры, шпион, триллион

**Адказ:** Іерусалім, Іякаў,Эфіопія, Альбіён, Ілiяда, Цыялкоўскі, Індыя, Кардыльеры, шпіён,трыльён.

**2 група**

***Перакладзіце на беларускую мову словы і запішыце іх.***

Ориентация, фиалка, район, гигиена, сольфеджио, биатлон, диета, радио, океан, фойе.

**Адказ:** Арыентацыя, фіялка, раён, гігіена, сальфеджыа, біятлон, дыета, радыё, акіян, фае.

**3 група**

***Выпраўце памылкі ў словах.***

Кліянтура, фіалка, нацыанальнасць, Неяпаль, віаланчэль, энтузіазм, шпіон, мемарыальны, файе, майонез.

**Адказ:** кліентура, фіялка, нацыянальнасць, Неапаль, віяланчэль, энтузіязм, шпіён, мемарыяльны, фае, маянез

**4 група**

***Гульня "Чацвертае лішняе": неабходна выпісаць чацвёртае лішняе слова ў кожным радзе, вусна растлумачыць выбар.***

1. бастыён, піянер, патрыёт, гладыёлус;
2. раён, раённы,маянэз, Маёраў;
3. іон, Іосіф, іонны, іанізацыя;
4. канвеер**,** езуіт, фае, гігіена
5. абрывіятура, Азія, акіян, варыянт

**Адказ**

1. бастыён, **піянер**, патрыёт, гладыёлус;
2. раён, раённы, **маянэз**, Маёраў;
3. іон, Іосіф, іонны, **іанізацыя**;
4. канвеер, езуіт, фае, **гігіена**
5. абрывіятура, Азія, **акіян**, варыянт

**Другі раздзел "Правапіс *У, Ў*"**

**1 група**

***Рашыце крыжаванку і растлумачце правапіс у і ў у адказах.***

1. Памяшканне, прызначанае для чытання лекцый, дакладаў.
2. Сцэнічнае пышнае відовішча з удзелам майстроў эстрады, цырка і інш.
3. Конны пастух у стэпах Паўночнай Амерыкі.
4. Трохмінутны перыяд у боксе, на працягу якога вядзецца бой.
5. Становішча ў спартыўных гульнях, калі мяч або шайба выходзіць за межы спартыўнай пляцоўкі.
6. Прыправа, падліва для стравы.

**Адказ**

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | А | | Ш | |
| | | | К | А | Ў | Б | О | Й |
| | Р | А | Ў | Н | Д | | У | |
| | | | | | Ы | | | |
| | | | А | Ў | Т | | | |
| С | | | | | О | У | С | |
| Р | | | | | | | | |
| Ы | | | | | | | | |
| Я | | | | | | | | |

**2 група**

***Устаўце патрэбную літару і размяркуйце нумары слоў у табліцы.***

| У | Ў |
|---|---|
| | |

**1**.Ваку..м, **2**. га..птвахта, **3**. аквары..м, **4.** тры..мф, **5.** Ванька-..станька, **6.** І..е, **7.** рады..с, **8.** рака ..са, **9**. со..с, **10.** фра.., **11.** бра..нінг, **12.** выпукла - ..вагнуты, **13**. па- ..чарашняму, **14.** на ..краіне, **15.** па..за, **16**. фа..на, **17.** кен-та..р, **18.** шлагба..м.

**Адказ**

| У | Ў |
|---|---|
| 1, 3, 4, 7, 8, 9, 10, 14, 18 | 2, 5, 6, 11, 12, 13, 15, 16, 17 |

**3 група**

***Складзіце табліцу- памятку па новым правапісе. Калі нічога не памянялася, ставім – , а калі правапіс змяніўся, ставім +***

**Адказ**

| **Было (1959)** | **Стала (2008)** |
|---|---|
| прамяні ультрафіялетавыя | прамяні ультрафіялетавыя |
| дзяржаўны універсітэт | дзяржаўны ўніверсітэт |
| нататкі уфолага | нататкі ўфолага |
| клаунада | клаўнада |
| ноў-хаў | ноу-хау |
| сауна | саўна |
| Зауралле, зауральскі | Заўралле, заўральскі |
| Фауст | Фаўст |
| Прагучала “Ура!” | Прагучала “Ура!” |

**4 група**

***Карэктар ( выпраўце памылкі і запішыце словы правільна).***

Жанчына-урач, дзед-усявед, хлопцы-ўмельцы, баўл, паўза, клаунада, аўканне, ва універсітэцε, шоў.

**Адказ:** Жанчына-ўрач, дзед-усявед, хлопцы-ўмельцы, баул, паўза, клаўнада, ауканне, ва ўніверсітэце, шоу

**Трэці раздзел "Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных"**

**1 група**

***Прачытайце фразеалагізмы, растлумачце іх лексічнае значэнне. Што ў іх агульнага? Дайце каментарый па напісанні вылучаных арфаграм.Прывядзіце свае прыклады фразеалагізмаў са словам вока.***

1. Хоць ***вока*** выкалі (нічога не відаць, цёмна).
2. Лезці ў ***вочы*** (назойліва маячыць перад вачамі, быць прыметным).
3. Берагчы як зрэнку ***вока*** (пільна сачыць, уважліва ахоўваць што-небудзь).
4. Глянуць адным ***вокам*** (няўважліва, хутка прачытаць што-небудзь).

**2 група**

***Адзначце словы, дзе няма прыстаўных гукаў (галосных або зычных).***

Воўк; вобраз; вобласць; вогненны; водалячэбніца; водар; водблеск;
возера; войска; восем; восеньскі; вугаль; вудзільна; ільвіца; ілюстрацыя; іржа; імгла; імгненне; імітацыя; імперыя; імшара; імя;інжынер; інтэлект; павук;павучальна.

**Адказ**

Воўк; водалячэбніца; войска; восем; ілюстрацыя; імітацыя; імперыя; імя; інжынер; інтэлект.

**3 група**

***Карэктар: знайдзіце словы, дзе ёсць арфаграфічная памылка. Запішыце сказы правільна.***

Я пайшоў на озеро. Яно вабіла да сябе, і ночу я часта сніў зялёныя вастравы ды сярэбраную месячную сцежку на ваддзе. Мгла засцілала наваколе нейкай казачнай прыгажосццю. Вунікальнае гэта слаунае мейсца.

**Адказ**

Я пайшоў на возера. Яно вабіла да сябе, і ноччу я часта сніў зялёныя астравы ды сярэбраную месячную сцежку на вадзе. Імгла засцілала наваколле нейкай казачнай прыгажосцю. Унікальнае гэтае слаўнае месца.

**4 група**

***Устаўце, дзе патрэбна, прапушчаныя арфаграмы ў словах***

Старая ..ольха; не ўлавіць ..мгненне; ..узкаватая дарога; бела..усы дзед; цемны за..улак; прыехаць ў а..ўторак; ..облачнае неба; горная на..ука; па..мчалі па дарозе; старая ..львіца.

**Адказ:** Старая вольха; не ўлавіць імгненне; вузкаватая дарога; белавусы дзед; цемны завулак; прыехаць ў аўторак; воблачнае неба; горная навука; памчалі па дарозе; старая львіца.

**VI. Рэфлексія**

Такія заданні абавязкова могуць трапіць вам на цэнтралізаваным тэсціраванні.

**Тэставая работа**

***Варыянт I***

1. Адзначце правільна напісаныя словы:

1. авіятар 4. дыяпазон
2. дзіятэз 5.геніяльнасць
3. дыягназ 6. Спартакіада

2. Адзначце словы, у якіх дапушчаны памылкі.

1. реакцыя; 4.спецыяльнасць;
2. фізіолаг; 5. біёлаг;
3. перыодыка; 6. меліярацыя.

3. Адзначце канструкцыі, дзе дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1. ад родных ніў, ад роднай хаты;
2. беларуска-украінскі слоўнік;
3. у "Звяздзе" урачыстасць;
4. продаж тавараў на аукцыёне.

4. Адзначце словы, дзе прапушчана літара ў

1. Салтыко… Шчадрын;
2. Юрый Рыхтэ… ;
3. Уладзіслаў За…ялаў;
4. Франц Га…с;
5. Раджы… Гандзі.

5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску пішацца прыстаўная літара:

1. па..уцінне, 4 ..учора,
2. ..удзіць, 5. ..узор,
3. трох..угольнік.

**Тэставая работа**

***Варыянт II***

1. Адзначце правільна напісаныя словы:

1. бастыён 4.піянер
2. віаланчэль 5. патрыёт
3. кіаскёр 6. Іоан

2. Адзначце словы, у якіх дапушчаны памылкі.

1. архіёлаг; 4. рэгіон;
2. стадзіён; 5. мельхіёр;
3.атракцыён; 6. аксіёма.

3. Адзначце канструкцыі, дзе дапушчаны арфаграфічныя памылкі:

1. Юбілейная універсіяда ;
2. Расціслаў, Заслаўе;
3. Дзяржаўная ўнія ;
4. Біць у літаўры .

4. Адзначце словы, дзе прапушчана літара ў

1. бліщчасты со…снік;
2. фінская са…на;
3. міжнароднае авіяшо…;
4. трафейны ма…зер;

5. адсвяткавалі меды…м

5. Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску няма прыстаўной літары

1. старая ..львіца, 4. на ..мшысты дол,
2. вырабы з ..льну, 5. за..мглёнае акно,
3. луста ..ржанога хлеба.

**Ключ**

| Адказы | | | |
|---|---|---|---|
| Варыянт I | | Варыянт II | |
| 1. | 1, 3, 4, 5 | 1. | 1. 4, 5 |
| 2. | 1,2,3 | 2. | 2,4 |
| 3. | 2. 3, 4 | 3. | 1, 2 |
| 4. | 1,3, 5 | 4. | 2, 4 |
| 5. | 1, 2, 3 | 5. | 1, 4 |

**Настаўнік:** Ці справіліся мы з задачамі, якія паставілі на пачатку ўрока? (*Вучні адказваюць*) Давайце звернемся да задач урока.

Ці згодныя вы са словамі Якуба Коласа:

Слова – радасць, слова – чары,
Вобраз вечна юных вёсен,
Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары,
Ты глядзіш праз неба просінь.

Абгрунтуйце сваю думку.

**VII. Дамашняя работа** (пры выкананні дамашняга задання вучні маюць права выбару)

Дыферэнцыраванае дамашняе заданне

1. § 15, падрыхтаваць лінгвістычнае паведамленне па тэме “Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапіс у, ў”.
2. Скласці тэст на тэму:
“Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах”.
“Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных”.
“Правапіс у, ў”.
3. Напісаць сачыненне-разважанне “Словы – радасць, словы – чары”.

**Ацэначны ліст**

| Ацэначны ліст (каго? Прозвішча, імя) | | |
|---|---|---|
| **Этап урока** | **Від задання** | **Балы - 55** |
| *Актуалізацыя і замацаванне раней засвоеных тэм* | Графічны дыктант (за кожнае правільнае сцвярджэнне -1 бал ) (усіх 16 балаў) | **16 балаў** |
| | | |
| *Тэарэтычны блок* | Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах | **5 балаў** |
| | | |
| | Правапіс *У, Ў* | **5 балаў** |

| | | |
|---|---|---|
| | | |
| | Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных | **5 балаў** |
| | | |
| | Правапіс прыстаўных і ўстаўных зычных | **5 балаў** |
| | | |
| *Практычны блок* | Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах<br>(1 група) | **10 балаў** |
| | | |
| | Правапіс *У, Ў* | **9 балаў** |
| | | |
| | Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных | **5 балаў** |
| | | |
| *Кантроль ведаў* | Выніковы тэст | **10 балаў** |

**Шкала для пераводу балаў у адзнаку**

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 |
| 0-6 | 7-13 | 14-20 | 21-26 | 27-33 | 34-40 | 41-46 | 47-52 | 53-54 | 55 |

Адзнака _____________

Тэма: **Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах;**
**правапіс у і ў;**
**правапіс устаўных і прыстаўных галосных і зычных**

**Задачы:**

- узнавіць і паглыбіць веды пра правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах;  правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных; правапіс у, ў ;

- выпрацоўваць уменні і навыкі знаходзіць дадзеныя арфаграмы тэкстах і выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні;

- выхоўваць беражлівыя адносіны і павагу да роднага слова, культуры, спадчыны беларуса

**Эпіграф:**

*Слова – радасць, слова – чары,*
*Вобраз вечна юных вёсен,*
*Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары,*
*Ты глядзіш праз неба просінь.*

*Якуб Колас*

**Ключ да графічнага дыктанта:**

| | | | |
|---|---|---|---|
| 1. | + | 9. | + |
| 2. | + | 10. | - |
| 3. | - | 11. | + |
| 4. | + | 12. | + |
| 5. | + | 13. | - |
| 6. | - | 14. | + |
| 7. | - | 15. | + |
| 8. | + | 16. | - |

| | пад націскам | не пад націскам | выключэнні |
|---|---|---|---|
| ИО | ІЁ ЫЁ<br>біёлаг, патрыёт | ЫЯ ІЯ<br>біялогія, патрыятычны | мільён, трыльён, шампіньён |
| | ІО<br>іон, Іосіф | ІА<br>іанізацыя | |
| ЕО | ЕО ЭО<br>фразеолаг, акардэон | ЕА<br>фразеалогія | |
| ЙО | Ё<br>ёд, раён | Я<br>маянэз, раяніраванне | |
| ИА | ІЯ ЫЯ<br>авіяцыя авіяцыйны | | |
| ЕА | ЕА ЭА<br>Неапаль тэатр | | |
| ИЕ | ІЕ ЫЕ<br>кліент, дыета | | |
| ЙЕ | Е<br>фае, канвеер | | Йемен |

| Літара у (у складовае ) пішацца | Літара ў (ў нескладовае ) пішацца |
|---|---|
| У пачатку сказа, пасля знакаў прыпынку і пасля зычных: У ціхім шолаху развяваліся сцягі, асветленыя сонцам, ярка блішчалі і звінелі медалі. Яны, мусіць, усё ж не звінелі, але яму гэтага хацелася, і ён, здаецца, чуў іхні звон. | Пасля галоснах у пачатку слова: на ўкраінскай мове, на ўзлеску, ва ўніверсітэце, царква ўніяцкая, метады ўніверсальныя |
| У пачатку ўласных назваў: каля Узды, ва Узбекістане, Галіна Уладзіміраўна | У сярэдзіне слова пасля галосных перад зычнымі: аўдыторыя, паўза, маўзалей, лаўрэат, саўна, фаўна, аўра, раўнд |
| У запазычаных словах, якія заканчваюцца на –ум, -ус: прэзідыум, радыус, соус і вытворных соус і вытворных | Пры чаргаванні [ л ] з [ ў]: чытаў, думаў, воўк, шоўк; але: памылка, сеялка, Балгарыя, Алжыр |
| У словах з націскным у : аул, баул, Брэсцкая унія, каля урны | Пры чаргаванні [ в ] з [ ў]: лаўка (лава), аўса (авёс), кроў (крыві), Аўстрыя, Каўказ; але: ва В’етнаме, на рацэ Влтава |
| У канцы запазычаных слоў не пад націскам : фрау, Шоу, ноу-хау | Пасля злучка ці двукосся, калі папярэдняе слова заканчваецца на галосны: хлопцы-ўмельцы, гучнае “ўра” |

**Ёсць ты ўсюды: ў сонца, ў хмары,**

**Ты глядзіш праз неба просінь**



*Харэй-двухскладовая стапа з націскам на першым складзе*


СКАРЫНЫ ,...
АД ПОЛАЦКА
СВЕТ






Сімяон Полацкі

| Прыстаўная літара а пішацца: | |
| --- | --- |
| **Тэарэтычны матэрыял** | **Прыклады** |
| **у некаторых словах перад збегам зычных, першы з якіх л, м, р** | аржаны, аржанішча, амшара, амшарына |
| **Заўвага! Гэтыя ж словы могуць ужывацца з прыстаўной літарай і: іржаны, іржанішча, імшара, імшарына.** | |

| Правапіс прыстаўной літары і | |
| --- | --- |
| **Прыстаўная літара і пішацца** | Прыклады |
| **у пачатку слоў перад спалучэннем літар, першая з якіх л, м, р** | |
| **перад літарай м заўсѐды** | імгненне, імчаць, імгла, імшысты |
| **перад літарамі л і р, калі гэтым словам пачынаецца сказ** | Ірвецца ў прастор вадаспад белапенны |
| **перад літарамі л і р, калі слова стаіць пасля знака прыпынку** | іржавы, ільняны |
| **перад л і р, калі слова знаходзіцца пасля папярэдняга слова на зычную** | з’езд ільнаводаў, дрот іржавы |
| **Прыстаўная літара і не пішацца** | Прыклады |
| **у пачатку слоў перад спалучэннем літар, першая з якіх л, м, р** | |
| **пасля прыставак, якія заканчваюцца на галосную** | памчаць, замглѐны, памкнуцца, зардзецца |
| **пасля першай часткі складаных слоў, якія заканчваюцца на галосную** | вокамгненна |
| ***перад л і р, калі слова знаходзіцца пасля папярэдняга слова на галосную** | на з’ездзе льнаводаў, луста ржанога хлеба |

## Правапіс прыстаўной літары г

у некаторых словах, параўн.: история, Анна (руск.) – гісторыя, Ганна (бел.);

у займенніках: гэты, гэтакі;

у няпэўна-колькасным лічэбніку гэтулькі;

у прыслоўях: гэтак, гэтаксама, дагэтуль, адгэтуль;

у часціцах: гэта;

у выклічніках: гэй, гэ, га, го.

## Правапіс прыстаўной літары в

перад о́ націскным у словах славянскага паходжання ў пачатку слоў, у сярэдзіне пасля прыстаўкі на галосны, ці першай часткі складанага слова: в + о́... = во́сень, во́кны, во́льха, во́блачны, заво́блачны, шматво́пытны;

у словах вочы, востры, навокал і вытворных ад іх незалежна ад націску: вачаняты, навастрыць, завастрыць, наваколіца;

у пачатку і сярэдзіне некаторых уласных назваў: Во́льга, Во́сіп, Во́гненная зямля, Ляво́н, Ларыво́н, Радзіво́н і вытворных ад іх: Лявонава, Радзівонаўна, Восіпаўна

перад у каранѐвым у пачатку слоў славянскага паходжання: вугаль, вучань, вуліца

перад у каранѐвым у сярэдзіне слоў або другой часткі складанага слова: завушніцы, павучок, чарнавус;

ва ўласных імѐнах Навум, Матэвуш, Тадэвуш і вытворных ад іх: Навуменка, Тадэвушаў

Запомніце! вушанка, вугор, вустрыца, цівун

## Прыстаўная в не пішацца:

перад а ненаціскным: асенні, акно, аблокі;

перад о́ націскным у словах іншамоўнага паходжання: о́да, о́птыка, о́пера, о́рдэн;

у словах оканне, окаць;

Адказ: **Іерусалім, Іякаў,Эфіопія, Альбіён, Іліяда, Цыялкоўскі, Індыя, Кардыльеры, шпіён,трыльён**

Адказ: **Арыентацыя, фіялка, раён, гігіена, сальфеджыа, біятлон, дыета, радыё, акіян, фае.**

Адказ: **кліентура, фіялка, нацыянальнасць, Неапаль, віяланчэль, энтузіязм, шпіён, мемарыяльны, фае, маянез**

| у | ў |
|---|---|
| 1, 3, 4, 7, 8, 9, 10, 14, 18 | 2, 5, 6, 11, 12, 13, 15, 16, 17 |

| Было (1959) | Стала (2008) |
| --- | --- |
| **прамяні ультрафіялетавыя** | прамяні ультрафіялетавыя |
| **дзяржаўны універсітэт** | дзяржаўны ўніверсітэт |
| **нататкі уфолага** | нататкі ўфолага |
| **клаунада** | клаўнада |
| **ноў-хаў** | ноу-хау |
| **сауна** | саўна |
| **Зауралле, зауральскі** | Заўралле, заўральскі |
| **Фауст** | Фаўст |
| **Прагучала “ура!”** | Прагучала “ура!” |

Адказ: **Жанчына-ўрач, дзед-усявед, хлопцы-ўмельцы, баул, паўза, клаўнада, ауканне, ва ўніверсітэце, шоу**

**Хоць *вока* выкалі** – нічога не відаць, цёмна)
**Лезці ў *вочы*** —назойліва маячыць перад вачамі, быць прыметным
**Берагчы як зрэнку *вока*** – пільна сачыць, уважліва ахоўваць што- небудзь
**Глянуць адным *вокам*** – няўважліва, хутка прачытаць што-небудзь

Адказ:

**Воўк; вобраз; вобласць; вогненны; вадалячэбніца; водар; водблеск; возера; войска; восем; восеньскі; вугаль; вудзільна; ільвіца; ілюстрацыя; іржа; імгла; імгненне; імітацыя; імперыя; імшара; імя; інжынер; інтэлект; паву к; павучальна**

Адказ:

**Я пайшоў на возера. Яно вабіла да сябе, і ноччу я часта сніў зялёныя астравы ды сярэбраную месячную сцежку на вадзе. Імгла засцілала наваколле нейкай казачнай прыгажосцю. Унікальнае гэтае слаўнае месца.**

Адказ:

**Старая вольха, не ўлавіць імгненне, вузкаватая дарога, белавусы дзед, цемны завулак,  прыехаць ў аўторак, воблачнае неба, горная навука, памчалі па дарозе, старая львіца.**

| Адказы | | | |
|---|---|---|---|
| Варыянт I | | Варыянт II | |
| 1. | 1, 3, 4, 5 | 1. | 1. 4, 5 |
| 2. | 1,2,3 | 2. | 2,4 |
| 3. | 2. 3, 4 | 3. | 1, 2 |
| 4. | 1,3, 5 | 4. | 2, 4 |
| 5. | 1, 2, 3 | 5. | 1, 4 |

# Задачы:

- узнавіць і паглыбіць веды пра правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах; правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных; правапіс у, ў ;

- выпрацоўваць уменні і навыкі знаходзіць дадзеныя  арфаграмы тэкстах і выкарыстоўваць іх у вусным і пісьмовым маўленні;

- выхоўваць беражлівыя адносіны і павагу да роднага слова, культуры, спадчыны беларусаў

## Дамашняя работа

**1. Лінгвістычнае паведамленне па тэме “Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах, правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных, правапіс у, ў”**

**2. Скласці тэст на тэму:**
**“Правапіс спалучэнняў галосных у запазычаных словах”**
**“Правапіс прыстаўных і ўстаўных галосных і зычных”**
**“Правапіс у, ў”**